Сказанае падкрэслівае актыўную ролю танца ў драматычным спектаклі. У дадзеным выпадку танец патрэбны акцёрам для таго, каб знайсці «ключ» да разумення сцэнічнага вобраза. Разам з тым танец адлюстроўвае сацыяльны аспект п'есы і час.

У псіхатэхніцы акцёрскага майстэрства танцавальныя навыкі садзейнічаюць разуменню і развіццю эацыянальнай памяці, фантазіі, тэмпарытму, сцэнічнай увагі. Здольнасць танца апеліраваць да рознай гамы чалавечых пачуццяў дазваляе ў руху правесці «выкід» эмоцый актыўней, чым у славеснай форме выяўлення.

Творчая фантазія акцёра «выцягвае» з падсвядомасці перажытыя ў танцы эмоцыі, якія пазней часта з'яўляюцца «ключом» акцёрскага вобраза, дапамагаюць акцёру знайсці «зерне» ролі. Сцэнічныя зносіны і ўвага таксама ўзаемазвязаны і знаходзяць сваё развіццё на танцавальных занятках. У танцы адбываецца асобны від зносін — праз тэмпарытмічную структуру дзеяння, а яна патрабуе ад акцёра якасна новай увагі. Пераход ад парнага танца да масавага звязаны з пошукамі новага падыходу да танцуючых, новай формай зносін з імі, іншага напрамку ўвагі.

Праблема танцавальна-пластычнай падрыхтоўкі акцёра не можа быць вырашана ў межах навучальнай установы. Акцёр павінен удасканальваць сваё выканальніцкае майстэрства на працягу ўсяго творчага жыцця. У сувязі з гэтым востра паўстае пытанне аб той ролі, якую павінен адыграць харэограф у драматычным тэатры. Сучаснаму драматычнаму тэатру неабходны не столькі балетмайстар-пастаноўшчык, колькі педагог-харэограф, здольны разняволіць цела акцёра, узбагаціць яго прафесійнымі харэаграфічнымі ведамі і навучыць выкарыстоўваць іх на практыцы. Спроба «загнаць» драматычнага акцёра ў межы строга вызначанага драматычнага тэксту не прыносіць поспеху, таму што акцёрская прырода патрабуе імправізацыі. У гэтым прынцыповае адрозненне прафесійнага танцоўшчыка ад драматычнага акцёра: першы не можа тварыць у незакончанай харэаграфічнай партытуры, другому ж цесна ў яе каардынатах, яму патрэбны жывы струмень імправізацыі, які кожны раз асвяжае вобраз і робіць непадобным адзін спектакль на другі. Імправізацыя дапускае свабоднае валоданне прадметам. Танцавальна-пластычны лексікон акцёра павінен пастаянна папаўняцца і аднаўляцца. Аднаўленне харэаграфічнага матэрыялу можа адбывацца як за кошт якаснага паляпшэння выканання рухаў, так і за кошт прыўнясення ў іх элементаў вышэйшага прафесійнага майстэрства. Жыццё ставіць перад сучасным чалавекам складаныя задачы. Тэатр павінен дапамагчы яму разабрацца ў іх, таму больш цеснае супрацоўніцтва майстроў драматычнага і музычнага тэатраў магло б адыграць важную ролю ў стварэнні новых яскравых сцэнічных формаў, якія дапамагаюць вызначыць шляхі да самых глыбокіх пачуццяў гледача. Гэта зрабіў у пачатку 80-х гадоў у тэатры імя Ленкама М.Захараў у Маскве. Ён прыцягнуў да работы ў сваім тэатры вядомых харэографаў і на доўгі час вырашыў пытанне аб пластычнай падрыхтаванасці сваіх акцёраў.

Па гэтаму шляху спрабуюць ісці і некаторыя беларускія тэатры.

Тэатральная школа робіць першы і самы значны крок у асэнсаванні будучым акцёрам значэння танцавальна-пластычнага руху на сцэне. Далейшае ўдасканальванне выканальніцкага майстэрства акцёра ў многім залежыць ад пераемнасці, якая павінна ляжаць у аснове ўзаемаадносін ВНУ і тэатра.

**Корбут А.А.,**
*аспірантка*

## УЛІК УЗРОСТАВЫХ АСАБЛІВАСЦЕЙ МАЛОДШЫХ ШКОЛЬНІКАЎ У МАДЭЛІРАВАННІ ГУЛЬНЯВОЙ ДЗЕЙНАСЦІ

У існуючай сёння сістэме выхавання малодшы школьны ўзрост вызначаецца як узрост з 6 да 10 гадоў (1-4 класы). Адной з галоўных праблем гэтага ўзросту з'яўляецца

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

тое, што дашкольнік становіцца школьнікам. З паступленнем у школу карэнным чынам змяняецца рытм жыцця дзяцей. Калі ў дашкольнікаў шмат вольнага часу, то ў малодшых школьнікаў яго значна менш, і гэты час павінен плённа імі выкарыстоўвацца.

Для поспяховага навучання ў пачатковай школе неабходна, каб дзіця магло выконваць тыя патрабаванні, якія прад'яўляе яму школа. Акрамя нармальнага фізічнага і разумовага развіцця, вельмі важнай з'яўляецца псіхалагічная падрыхтаванасць да навучання, бо ў школе дзіця ўступае ва ўзаемаадносіны з настаўнікам, аднагодкамі, фарміруюцца новыя ўзаемаадносіны ў сям'і (я -- школьнік, у мяне ёсць свае абавязкі). У гэты перыяд дзеці набываюць навыкі хуткага і дакладнага выканання даручаных заданняў, добрасумленных адносін да прыроды. Таму праблемай школы становіцца фарміраванне фізічнай, разумовай, працоўнай, маральнай падрыхтаванасці малодшых школьнікаў да навучання. Для дзяцей гэтай узроставай катэгорыі характэрны наступныя псіхалагічныя асаблівасці: эмацыянальнасць, імкненне да ўдзелу ў масавых дзеяннях, схільнасць да падражальнасці. Таму дзіцячыя ранішнікі, масавыя гульні — найбольш папулярныя формы, якія выкарыстоўваюцца ў пазакласнай рабоце з дзецьмі.

З самага пачатку вучэбнай дзейнасці ў дзяцей адбываюцца змены ў накіраванасці іх інтарэсаў. Даследаванні вучоных-псіхолагаў паказваюць, што ў канцы дашкольнага перыяду ў дзяцей звычайна ўзнікае патрэба вучыцца. Яна праяўляецца ў гульнявой дзейнасці. Дашкольнікі з задавальненнем гуляюць «у школу». У школе (1 клас) фарміруюцца цікавасць да самой вучэбнай дзейнасці, імкненне да пазнання новага. Таму трэба развіваць у дзяцей цікавасць, назіральнасць, бо яны з'яўляюцца асновай пазнавальных інтарэсаў. Працуючы з дзецьмі малодшага школьнага ўзросту, трэба ведаць наступныя характэрныя асаблівасці іх інтарэсаў:

1) пераймальнасць (характарызуецца выпадковасцю ўзнікнення);

2) зменлівасць (кароткачасовасць);

3) павярхоўнасць (цікавыя толькі знешнія факты, асабліва яркія, незвычайныя);

4) цікавасць да таго, што блізка ўласнаму жыццёваму вопыту дзяцей;

5) раскіданасць (цікавяцца рознымі галінамі ведаў без усялякай іх сувязі, задаюць мноства пытанняў);

6) накіраванасць на бліжэйшы вынік (перамаглі ў спаборніцтве ці не, вырашылі задачу ці не і г.д.).

Абапіраючыся на ўказаныя асаблівасці, трэба сказаць, што культарганізатар ці сацыяльны педагог у рабоце з дзецьмі (1-4 класы) павінен выкарыстоўваць такія формы работы, якія б дапамагалі пашырыць кругагляд дзяцей.

Пры арганізацыі розных мерапрыемстваў нельга не ўлічваць хутка надыходзячай у малодшых школьнікаў пераўзбуджальнасці ад зносін і залішне актыўнай дзейнасці і стомленасці. Таму нават у сур'ёзных па тэматыцы мерапрыемствах, занятках неабходны музычна-рухавыя паўзы.

У малодшым школьным узросце ва ўспрыманні розных з'яў яшчэ пераважае дзеянне першай сігнальнай сістэмы над другой. Таму мерапрыемствы наглядна-вобразнага характару ўспрымаюцца глыбей. Сустрэчы з вядомымі кніжнымі героямі, насычанасць сцэнарыяў вершамі, дэманстрацыя розных кінафільмаў, тэатралізацыя, маляўнічасць афармлення памяшкання, запрашальных білетаў — усё гэта робіць свята прывабным, запамінальным.

У гэтым узросце на фарміраванне важнейшых якасцей асобы ў значнай ступені ўплывае праца. Таму важнае значэнне маюць гурткі макрамэ, канструявання, «Зрабі сам» і інш. У працэсе працы дзіця развіваецца, яно мае магчымасць падумаць, паразважаць, як зрабіць тую ці іншую аперацыю. Дзеці самі плануюць свае дзеянні, што вядзе да развіцця абстрактнага мыслення. Вялікае значэнне для фарміравання ў малодшых школьнікаў станоўчых адносін да працоўнай дзейнасці маюць пачуцці, якія звязаны з паспяхова выкананай працай. Дзіця адчувае радасць, задавальненне ад таго, што яно нешта робіць

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сваімі рукамі, што ў яго добра атрымліваецца тая ці іншая рэч. Гэта стымулюе яго да актыўнай працоўнай дзейнасці. Нельга не звярнуць увагу на фізіялагічныя змены, якія адбываюцца ў арганізме дзяцей малодшага школьнага ўзросту. Змены адбываюцца ва ўсіх органах і тканках цела. Фарміруюцца ўсе выгібы пазваночніка: шыйны, грудны і паяснічны. Не скончана яшчэ акасцяненне шкілета. Адсюль яго значныя рухомасць і гібкасць, якія даюць вялікія магчымасці для правільнага фізічнага выхавання і заняткаў многімі відамі спорту, але адначасова тояюць у сабе і небяспеку (пры адсутнасці нармальных умоў фізічнага развіцця). У гэтым узросце мацнеюць мышцы і звязкі, расце іх аб'ём, узрастае агульная мышачная сіла. Пры гэтым буйныя мышцы развіваюцца раней дробных. У сувязі з гэтым дзеці найбольш здольныя да размашыстых рухаў, але яны цяжэй спраўляюцца з дробнымі рухамі, якія патрабуюць дакладнасці. У гэтым узросце інтэнсіўна расце і забяспечваецца кроўю мышца сэрца, таму яно параўнальна вынослівае. Змяняюцца ўзаемаадносіны працэсаў узбуджэння і тармажэння. Тармажэнне (аснова стрыманасці, самакантролю) становіцца больш відавочным, чым у дашкольнікаў. Аднак схільнасць да ўзбуджэння яшчэ вельмі значная, адсюль — непаседлівасць малодшых школьнікаў. Нездарма ў гэтым узросце значнае месца займаюць рухавыя гульні, якія не толькі садзейнічаюць фізічнаму развіццю дзіцяці, але ўплываюць на фарміраванне якасцей асобы: у іх развіваюцца воля, кемлівасць, з'яўляецца жаданне памерацца з аднагодкамі спрытнасцю, сілай. Спартыўныя гульні і спаборніцтвы ў гэтым узросце развіваюць уменні дзейнічаць у калектыве, падтрымаць таварыша і інш. Кожная гульня павінна несці у сабе момант эмацыянальнай насычанасці, які характарызуецца адчуваннем задавальнення. Задавальненне, якое перажываецца ў працэсе гульні, аказвае вялікі ўплыў на дзяцей. Радасны настрой у гульні суправаджаецца буйнымі фізіялагічнымі зменамі ў арганізме дзіцяці: яго рухі становяцца моцнымі і хуткімі, чырвань выступае на твары, вочы блішчаць. Усё гэта звязана з узмоцненым абменам рэчываў у арганізме, павышанай дзейнасцю дыхання і кровазвароту. Можна сказаць, што мозг дзіцяці так адчувае патрэбу ў задавальненні, як лёгкія патрабуюць кіслароду. Пры гэтым важна не толькі тое, што вясёлыя гульні ў вышэйшай ступені ўзбуджаюць нервовую энергію дзіцяці, але галоўным чынам тое, што яны выклікаюць актыўную дзейнасць вышэйшых аддзелаў галаўнога мозга, якія звязаны з асацыятыўнымі, інтэлектуальнымі і валявымі працэсамі. Значыць, пры арганізацыі гульнявой дзейнасці з малодшымі школьнікамі неабходна ўлічваць наглядна-вобразнае мысленне дзяцей, іх фізіялагічныя магчымасці, пазнавальную актыўнасць, няўстойлівасць інтарэсаў. Вельмі важна, каб мерапрыемствы былі эмацыянальна насычанымі, гульні падбіраліся з улікамі вышэйпамянёных асаблівасцей дадзенага ўзросту. Абгрунтаванне месца і ролі гульні ў жыцці малодшага школьніка павінна, відаць, абапірацца на наступныя палажэнні. Па-першае, на дадзеным ўзроставым этапе сюжэтна-ролевая гульня ў дашкольнікаў не знікае, а застаецца як форма, у якой найбольш паспяхова можа засвойвацца змест новай дзейнасці (і пазнавальнай, і працоўнай) і ісці развіццё мастацкіх відаў творчай дзейнасці. Сказанае абазначае, што неабходна ажыццяўляць паступовы пераход ад гульні да навучання: актыўна весці пошук гульнявых формаў пазнання адначасова з укараненнем спецыфічных для вучэбнай дзейнасці прыёмаў і метадаў. Па-другое, прысутнасць у жыцці школьніка гульні — гэта эмацыянальная апора для асобы, таму што яна застаецца найбольш блізкай і добра асвоенай малодшымі школьнікамі дзейнасцю. Гэты від дзейнасці аблягчае адаптацыю да патрабаванняў школы, новага калектыву і рэжыму дня. У гульні дзіця бярэ ўзоры для вырашэння новых жыццёвых задач і, такім чынам, яму забяспечваецца псіхалагічны камфорт, які мае немалае значэнне для нармальнага развіцця разумовых, маральных і фізічных сіл. Патрэцяе, элементы творчага выяўлення, самастойнасць і актыўнасць школьніка ў асяроддзі равеснікаў таксама вырастаюць з гульні і на працягу ўсяго малодшага школьнага, а затым і падлеткавага ўзросту могуць плённа жывіцца з гэтай крыніцы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ